**С. Я. Новікаў**

***80-й гадавіне вызвалення Беларусі прысвячаецца***

# ВЫЗВАЛЕННЕ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1943–1944 гг. У НАЙНОЎШЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Памяць аб вызваленні беларускай тэрыторыі ад германскіх захопнікаў, 80-годдзе якога наша краіна адзначае ў гэтым годзе, шмат у чым вызначае фармат сучаснага гістарычнага дыскурсу пра баявыя дзеянні Чырвонай арміі цягам восені 1943–лета 1944 г. Чарговы юбілей, да моманту святкавання якога выраслі цэлыя тры пасляваенныя пакаленні беларусаў, з'яўляецца тым важным рубяжом, што вымагае ад нашчадкаў гістарычнай Перамогі адэкватнай даследчыцкай рэфлексіі, адпавядаючай не толькі патрабаванням цяперашняй гістарычнай навукі, але і сучаснаму перадавому ўзроўню вывучэння Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У такім кантэксце аўтар прапануе некаторыя вынікі кампаратыўнага аналізу чатырох нацыянальных гістарыяграфій – беларускай, расійскай, польскай і нямецкай. У фокусе нашага даследавання знаходзяцца баявыя дзеянні Чырвонай арміі і Германскага вермахта на заключным этапе вызвалення Беларусі ў 1943–1944 гг. Апроч таго, актуальнасць такому даследчаму кірунку надаюць наступныя падыходы. Па-першае, той факт, што супастаўленне розных вынікаў з'яўляецца адной з найбольш прадуктыўных умоў усебаковага вывучэння гісторыі баявых дзеянняў часцей Чырвонай арміі і Германскага вермахта, а таксама перспектыўнай формай набліжэння айчынных даследаванняў да дасягненняў сусветнай гістарычнай навукі. Па-другое, у самой кампаратывістыцы ў апошні час набірае моц тэндэнцыя да сінтэзу даных, атрыманых прадстаўнікамі розных гістарыяграфічных школ ці нацыянальных гістарыяграфій (выдатным прыкладам тут з'яўляецца цяперашняе супрацоўніцтва беларускіх гісторыкаў з іх расійскімі і нямецкімі калегамі). Па-трэцяе, вырашальным фактарам для пашырэння сферы выкарыстання кампаратыўных ведаў стала меўшая месца часовае знікненне жалезнай заслоны, у выніку чаго з'явіліся больш спрыяльныя магчымасці для правядзення грунтоўных гістарычных даследаванняў на базе шырокага выкарыстання дакументальных крыніц процілеглых бакоў.

І ў рэшце рэшт становіцца больш відавочным, што факт знаходжання любой з нацыянальных гістарыяграфій у фармальных рамках папярэдніх тэарэтычных канцэпцый, традыцыйных напрацовак і метадычных падыходаў пакідае яе далёка ад перадавых гістарычных ведаў. Таму на парадку дня беларускай ваенна-гістарычнай навукі стаіць важная задача па правядзенні параўнаўчага аналізу тэарэтычных падыходаў, замацаваных у навуковых канцэпцыях па гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг., вызначэнні метадалагічнага ўзроўню галоўных базавых палажэнняў, а таксама выяўленні ступені доказнасці фактычнай аргументацыі ў сучасных гістарычных даследаваннях.

Аналіз навуковых даследаванняў згаданай вышэй праблематыкі ў чатырох нацыянальных гістарыяграфіях паказаў, што беларускія і расійскія гісторыкі не толькі выкарыстоўваюць адзіную дакументальную базу, але і зыходзяць з агульнай базавай парадыгмы з яе фундаментальнымі навуковымі ўстаноўкамі, уяўленнямі і тэрмінамі, а таксама з устойлівымі даследчыцкімі ацэнкамі ў дачыненні да прычын, ходу і вынікаў баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі цягам яе вызвалення, пачынаючы з восені 1943 і да канца лета 1944 года.

Увогуле сучаснай чытацкай аўдыторыі падавалася, што гісторыя баявых дзеянняў у ходзе Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі 1944 г., як і іншых наступальных аперацый у ходзе бітвы за Беларусь і яе поўнае вызваленне, павінна быць даўно добра даследаванай тэмай. Аднак гэта не так. Аматары ваеннай гісторыі па цяперашні час на кніжных паліцах не могуць знайсці даследаванні, у якіх даваліся б адказы на вострыя пытанні аб Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Б е л а р у с ь. Зыходным момантам для разгляду баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг. возьмем фактагічны нарытыў з энцыклапедыі «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945» [1], падрыхтаванай у апошнія гады савецкай перабудовы. Яго аналіз дазваляе адразу ж убачыць, што ў баявых падзеях восені і зімы 1943/1944 гадоў і лета 1944 г. поўна не адлюстроўваюцца фактычныя дзеянні Чырвонай арміі на першым этапе вызвалення беларускай тэрыторыі. Чытач там не знойдзе вычарпальную факталагічную інфармацыю пра няўдалыя спробы войскаў Заходняга фронту вызваліць паўночна-ўсходнія раёны Беларусі ўжо восенню 1943 – у пачатку 1944 г. У тэкставых матэрыялах аб «Беларускай аперацыі 1944» [1, с. 71–74] і «Віцебска-аршанскай аперацыі 1944» [1, с. 126–127] галоўны акцэнт аўтарамі зроблены толькі на асвятленне ходу, выніках і значэнні Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», якой завяршалася, а не пачыналася поўнае вызваленне тэрыторыі Беларусі.

У той жа час зварот да савецкай энцыклапедыі «Великая Отечественная война, 1941–1945» [2] паказвае, што ў артыкуле «Заходні фронт» ідзе размова аб тым, што ў канцы 1943 – пачатку 1944 г. войскі Заходняга франту наступалі на віцебскім і аршанскім напрамках і выйшлі ва ўсходнія раёны Беларусі [2, с. 278]. З кароткага аналізу факталагічнага нарытыву энцыклапедычных матэрыялаў вынікае, што чытач на той час быў пазбаўлены магчымасці скласці поўную карціну гісторыі баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1943 – пачатку 1944 г.

Не змянілі яе і прафесійныя намаганні І. В. Цімаховіча [3] і У. І. Лемяшонка [4], хто ў першай палове 1990-х гадоў актыўна працаваў над ліквідацыяй “белых плям”, якія заставаліся ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўвогуле і ў адлюстраванні гістарычных падзей па вызваленні Беларусі ў прыватнасці. У першай працы, якая выйшла да 50-годдзя вызвалення Беларусі, практычна ўпершыню чытачу даводзіліся лічбы цяжкіх страт у жы-

вой сіле і баявой тэхніцы, панесеных войскамі Заходняга фронту ў час правядзення імі наступальных аперацый у перыяд з 12 кастрычніка 1943 г. да 1 красавіка 1944 г. На думку даследчыка, няўдачы наступлення Заходняга фронту можна патлумачыць шматлікімі прычынамі аб'ектыўнага і суб'ектыўнага парадку [3, с. 128], без дакументальнага пацверджання на матэрыялы Даклада камісіі Дзяржаўнага камітэта абароны (ДзКА) ад 11 красавіка 1944 г. Важным нам бачыцца тэза даследчыка аб тым, што на той час не ўсе падзеі атрымалі належнае асвятленне, шматлікія ваенныя дзеянні, якія праходзілі на беларускай зямлі, заставаліся ў цяні [3, с. 5]. Не вырашылі гэтай задачы і новыя падыходы другога беларускага даследчыка пры асвятленні гісторыі вызвалення Беларусі без грыфа "сакрэтна" [4]. Важнай адметнасцю яго працы было выкарыстанне не толькі малавядомых дакументаў з ЦАМА, але і ўвядзенне ў шырокі зварот нямецкіх трафейных дакументаў, перакладзеных ім на беларускую мову. На наш погляд, аўтару ўдалося прадставіць аб'ектыўную карціну вызвалення Беларусі Чырвонай арміяй, прычым абапіраючыся на архіўныя дакументы, значная частка якіх раней не друкавалася.

Зусім невыпадкова, што ў апошнія гады гісторыкі суверэннай Беларусі зрабілі важныя крокі для таго, каб на новым тэарэтычным узроўні і фактала-гічнай базе расставіць адпаведныя навуковыя акцэнты ў дачыненні да баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні Беларусі ў 1943–1944 гг. Разгледзім гэты тэзіс у найноўшых акадэмічных выданнях: «Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.» [5], «Освобождение Беларуси 1943–1944» [6] і «Страна в огне. Освобождение. 1944–1945. Очерки» [7]. З іх вынікае цяперашні гістарыяграфічны наратыў, які ўтрымлівае даволі падрабязную характарыстыку баявых дзеянняў Чырвонай арміі ў ходзе вызвалення Беларусі. Так, у дачыненні да падзей лета 1944 г. прафесійныя даследчыкі выкарыстоўваюць такія тэрміны: «Беларуская наступальная аперацыя 1944 г. "Баграціён"»; «Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя»; «Аперацыя "Баграціён"»; «Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён"». У той жа час у адносінах да малавядомых 11 наступальных аперацый, праведзеных Заходнім фронтам у канцы 1943 – пачатку 1944 г. на віцебскім (тры), багушэўскім (дзве) і аршанскім (шэсць) напрамках, даследчыкі ўжываюць іх канкрэтныя назвы.

Канцэптуальна гэтыя падзеі звязаны наступным чынам: калі ў першым выданні выкарыстана такая дэфініцыя, як «основные действия на белорусском направлении вынуждали противника держать тут мощную группировку, не дав тем самым перебросить части своих войск на юг» [5, с. 432], дык трэцяя праца практычна вяртае чытача да класічнага тэзіса савецкай гістарыяграфіі: «советские войска держали в постоянном напряжении противостоящие 3-ю танковую и 4-ю армии вермахта, сковывали их войска и нанесли им значительный урон» [7, с. 414]. Заўважым, што апошні тэзіс адразу ж выклікае пытанні па той простай прычыне, што паводле дырэктыў Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, аддадзеных 12, 18 лістапада і 23 снежня 1943 г., а таксама 18 студзеня 1944 г. камандуючым войскамі 1-га Прыбал-

тыйскага і Заходняга франтоў, ставілася адзіная задача «О разгроме витебской группировки противника» [8; 9; 10; 11]. Паводле зместу дырэктыў размова ідзе выключна аб наступленні і поўным разгроме праціўніка (!), але не аб тым, каб у ходзе наступлення стрымаць, запыніць ці скаваць яго рух на ўсход. Чаму тут беларускія і расійскія гісторыкі не даюць рэальнага тлумачэння гістарычных фактаў і вядомых дакументаў? Чаму не працягваецца практыка, уведзеная яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў расійскім даследчыкам М. А. Гарэевым у дачыненні да тых падзей?

Як вядома, у першай палове 1990-х гадоў былы ўдзельнік наступальных аперацый на віцебскім напрамку М. А. Гарэеў паспрабаваў не толькі паказаць ход няўдалых наступальных аперацый, але і знайсці адказы на складаныя пытанні аб прычынах стратэгічных, арганізацыйных і аператыўна-тактычных няўдач, выкарыстоўваючы для гэтага фактычна ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот не апублікаваны ў савецкі час Даклад камісіі ДзКА ад 11 красавіка 1944 г. Адзначым, што менавіта ў такім ключы працавалі беларускія гісторыкі, аўтары спецыяльнага выдання «Освобождение Беларуси. 1943–1944», якое выйшла да 60-годдзя вызвалення беларускай зямлі ад германскіх захопнікаў. Дзякуючы звароту да малавядомага дакумента, беларускія аўтары намалявалі карціну баявых дзеянняў і выявілі фактычныя прычыны няўдач, раскрылі пры гэтым рэальныя вынікі, маштабы страт і пралікаў.

Атрымліваецца, што па цяперашні час у беларускай гістарыяграфіі яшчэ не праведзена спецыяльнае даследаванне, у аснове якога ляжалі б новыя гістарычныя веды, атрыманыя на падставе аналізу, супастаўлення і навуковай верыфікацыі ўсяго наяўнага комплексу айчынных і замежных дакументаў, а таксама найноўшай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ў дачыненні да баявых дзеянняў Чырвонай арміі і Германскага вермахта ўвосень 1943–летам 1944 года. Хоць на справе назапашаны значны эмпірычны матэрыял, які пакуль застаецца без глыбокага тэарэтычнага аналізу. Таму чытач да гэтага часу не мае грунтоўнага даследавання аб пачатку вызвалення тэрыторыі Віцебшчыны яшчэ ў лютым 1942 г. Навукова маладаследаваным застаецца і другі этап вызвалення, які пачаўся ўвосень 1943 г. Як і заключны этап вызвалення ў ходзе правядзення Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі “Баграціён” чакае свайго прафесійнага даследчыка беларускага паходжання.

Р а с і я. Кажучы пра расійскую гістарыяграфію, прысвечаную гісторыі вызвалення Беларусі ў 1943–1944 гг., спынімся толькі на найноўшых выданнях. Першае з іх, 4-томная праца «Великая Отечественная война. 1941–1945» [12], было падрыхтавана пры супрацоўніцтве Расійскай акадэміі навук і Міністэрства абароны РФ і выдадзена ў канцы 1990-х гадоў у жанры ваенна-гістарычных нарысаў. Трэцяя кніга прысвечаная заключнаму перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Заўважым, што раздзел пад назвай «Няўдачы на заходнім напрамку» падрыхтаваў М. А. Гарэеў, які паспрабаваў адыйсці ад некаторых палажэнняў на той час ужо вядомага Даклада камісіі ДзКА ад

11 красавіка 1944 г., значна глыбей аналізуючы рэальныя прычыны няўдач Чырвонай арміі на заходнім напрамку. Важна, што пры гэтым аўтар звярнуўся да дысертацыйнага даследавання В. І. Фесенкі «Причины неудач наступательных операций Западного фронта в Белоруссии осенью 1943 – зимой 1944 г.: выводы и уроки» на атрыманне ступені кандыдата гістарычных навук, абароненага ў Інстытуце ваеннай гісторыі МАРФ у Маскве ў 1992 г. Прадстаўляючы ў трэцім томе аперацыю «Баграціён», расійскія даследчыкі адзначаюць, што яна па праву можа лічыцца адной з самых бліскучых не толькі Вялікай Айчыннай, але і Другой сусветнай вайны: «Операция “Багратион”» явилась первой стратегической наступательной операцией Красной Армии, проведенной в период, когда в Западной Европе начали военные действия вооруженные силы США и Англии» [12, с. 76].

Аналіз матэрыялаў, якія ўвайшлі ў 4-ы том «Освобождение территории СССР. 1944 год» новага 12-томнага фундаментальнага выдання «Великая Отечественная война 1941–1945 годов» [13] дае магчымасць убачыць асноўныя падыходы, ацэнкі і вынікі ў дачыненні да баявых дзеянняў ва ўсходняй Беларусі і пры яе вызваленні ў ходзе «Беларускай наступальнай аперацыі» ці «аперацыі “Баграціён”» [13, с. 347]. Аўтары таксама прыходзяць да высновы, што «операция “Багратион”» явилась первой стратегической наступательной операцией Красной Армии, проведенной в период, когда в Западной Европе начали военные действия вооруженные силы США и Англии» [14, с. 52]. У той жа час, характарызуючы баявыя дзеянні на цэнтральным участку савецка-германскага фронту, даследчыкі адзначаюць, што на тэрыторыі Беларусі гэтаму рубяжу на той момант была адведзена «ўскосная роля» [13, с. 102]. У працы сцвярджаецца, што ў ходзе наступальных аперацый савецкія войскі панеслі істотныя страты ў асабовым складзе і ваеннай тэхніцы, выкарысталі вялікую колькасць боепрыпасаў. Пры гэтым расійскія аўтары цалкам паўтараюць тэзіс савецкага часу аб тым, што няўдалыя дзеянні Заходняга фронту на цэнтральным участку савецка-германскага фронту «сковали группу армий “Центр”, не позволив ей оказать помощь терпевшим катастрофическое поражение группам армий “Юг” и “А”» [13, с. 117]. Звернем увагу чытача на тое, што падобны тэзіс быў уведзены яшчэ ў 1970-я гады ў 12-томніку «История Второй мировой войны. 1939–1945». Так, у восьмым томе пры разглядзе «военных [баявых. – *С. Н.*] действий на западном направлении» сцвярджалася, што «активными действиями в течение всей зимы и первых весенних месяцев 1-й Прибалтийский, Западный и 1-й Белорусский фронты сковывали основные силы мощной по своему составу группы армий “Центр”, не позволяя немецко-фашистскому командованию за счет ее сил оказывать помощь группам армий “Юг”, “А” и “Север”, терпевшим в то время тяжелейшие поражения» [14, с. 137].

Адзначым, што агульнай прыкметай для згаданых беларускіх і расійскіх выданняў з’яўляецца фактычная адсутнасць спасылак на дакументы супрацьлеглага боку пры аналізе гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі. У названых працах даследчыкі

практычна не выкарыстоўваюць спецыяльныя нямецкія даследаванні, у такой форме абыходзячы маўчаннем найноўшыя замежныя распрацоўкі аб баявых дзеяннях Чырвонай арміі і Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі. Да ўсяго, гісторыкі не ўвялі ў навуковы зварот трафейныя нямецкія дакументы, якія захоўваюцца ў фондах РДзВА ў Маскве і ЦАМА РФ у Падольску. Не з’яўляецца выключэннем і 4-ы том найноўшага 12-томнага выдання, дзе пры разглядзе баявых дзеянняў ва ўсходняй Беларусі ў канцы 1943 – пачатку 1944 г. аўтары прывялі 251 спасылку, але толькі ў 12 з іх ёсць згадка на 8-ы том «Германскі рэйх і Другая сусветная вайна», які носіць назву «Усходні фронт 1943/44» [15]. Ці можа такое кропкавае выкарыстанне спрыяць усёабдымнаму даследаванню двухбаковых баявых дзеянняў, асабліва высвятленню дакладных прычын няўдач Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг.?

У такой сітуацыі ў чытача складваецца ўражанне, што ў тэксце нагрувашчаны вялікі масіў эмпірычных матэрыялаў, датычных тых гістарычных падзей. Фактычна ў падобным ключы беларускія і расійскія аўтары пішуць агульную карціну баявых дзеянняў Чырвонай арміі, дзе дэманструюць толькі адзін – савецкі бок, які даволі часта выступаў супраць «безыменнага праціўніка»: без прывядзення канкрэтных звестак пра агульны колькасны і штатны састаў германскіх палявых і паветраных часцей вермахта, без вызначэння дакладнай лакалізацыі войск праціўніка на мясцовасці, не раскрываючы структуры яго баявых падраздзяленняў, маштабаў выкарыстання тэхнікі і ўзбраенняў, і ў выніку не параўноўваючы панесеныя з абодвух бакоў страты, агульную колькасць зніклых без вестак, патрапіўшых у палон і г.д. Гэта значыць, чытача пераконваюць, што без фактычнай ацэнкі сіл праціўніка аддаваліся загады аб правядзенні наступальных аперацый па вызваленні Беларусі ў 1943–1944 гг. А на справе гэты было далёка не так.

Важным фактам у гэтым пераліку можна назваць працу А. В. Ісаева “Операция «Багратион». «Сталинский блицкриг» в Белоруссии”, якая выйшла да 75-годдзя правядзення аперацыі [16]. Дадзенае даследаванне неабходна разглядаць у кантэксце аўтарскай канцэпцыі, паводле якога прадугледжваецца напісанне дзвюх самастойных прац, аб’яднаных адзінай ідэяй паказу геніяльнай аперацыі па вызваленні Беларусі летам 1944 г. У фокусе першай часткі даследавання апынуліся галоўным чынам падзеі, якія адбываліся на Заходнім фронце ў перыяд з кастрычніка 1943 г. і да яго расфарміравання, калі па тэрыторыі Беларусі пралягаў пазіцыйны фронт: ён прывёў да правалу 11 наступальных аперацый Чырвонай арміі. Гэтай ваеннай паразе ў працы надаецца тэрмін “рускі Вердэн” [16, с. 49], што выклікае пэўныя пытанні на падставе адной з галоўных прычын – геаграфічнай лакалізацыі баявых падзей Чырвонай арміі выключна на тэрыторыі Беларусі. Важна звярнуць увагу на падыход расійскага даследчыка, які падзяляе Беларускую стратэгічную наступальную аперацыю на два этапы, разглядаючы баявыя дзеянні Чырвонай арміі і Германскага вермахта цягам часу толькі ад 23 чэрвеня па 4 ліпеня 1944 г., то бок да даты вызвалення беларускай сталіцы – Мінска. У выніку

расійскі аўтар заключае, што ў ходзе правядзення двух франтавых удараў, у цэнтры якіх ляжаў Бабруйск, адбылася катастрофа нямецкіх сіл і быў прадвызначаны ўвесь ход летняй кампаніі 1944 г., у тым ліку вызвалення тэрыторыі Беларусі.

У другой працы "Операция «Багратион». Взлом «белорусского балкона»" [17] расійскі даследчык з выкарыстаннем дакументальных крыніц рознага паходжання раскрывае далейшы ход адной з "геніяльных савецкіх аперацый" – аперацыі "Баграціён". Як заключае аўтар, гэта аперацыя стала пэўнай расплатай за гітлераўскі бліцкрыг. Роўна праз тры гады Чырвоная армія цалкам разлічылася за катастрафічны пачатак вайны, разграміўшы групу армій "Цэнтр" на тэрыторыі Беларусі [17, с. 5]. Ад сябе дададзім, наколькі карэктным з'яўляецца ўжыванне расійскім даследчыкам тэрміна "бліцкрыг", што гістарычна было звязана з агрэсіяй супраць савецкай краіны, яе захопам і разгромам, а не вызваленнем.

У год 75-й гадавіны аперацыі ў Маскве выйшлі даследаванні не толькі знакамітага ў Расіі і за яе межамі аўтара шэрагу кніг па Вялікай Айчыннай вайне А. В. Ісаева, але і малавядомага на той час у айчыннай гістарычнай навуцы расійскага даследчыка М. У. Сініцына [18]. Апошні ўпершыню падрабязна і аб'ектыўна расказаў аб планаванні, падрыхтоўцы і правядзенні ў канцы чэрвеня 1944 г. Бабруйскай наступальнай аперацыі 1-га Беларускага фронту. Пры гэтым у якасці крыніц аўтар выкарыстаў дакументы ЦАМА і нямецкія архіўныя матэрыялы для паказу адной з вузлавых падзей у ходзе самай яркай аперацыі савецкіх войскаў у гады Вялікай Айчыннай вайны – Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі "Баграціён". Адразу неабходна звярнуць увагу на смеласць аўтарскага падыходу ў дачыненні да падрыхтоўкі больш чым 400-старонкавага навукова-гістарычнага выдання аб адным з важных эпізодаў ваеннай гісторыі Беларусі. Другім значным момантам для нас з'яўляецца той факт, што паводле дакументальных звестак гістарычны перыяд правядзення Бабруйскай наступальнай аперацыі меў больш шырокія часавыя рамкі ў параўнанні з тым, што было замацавана з савецкіх часоў у беларускай гістарыяграфіі, і скончыўся не 29 чэрвеня, а 1 ліпеня 1944 г. [18, с. 303]. У гэтай сувязі ўзнікаюць важныя пытанні, датычныя таксама іншых бакоў правядзення Бабруйскай наступальнай аперацыі, асабліва ў аспекце забеспячэння "поўнага" разгрому нямецкіх войскаў у Бабруйскім "катле", баявых дзеянняў дакладных вайсковых падраздзяленняў Чырвонай арміі на лініі наступлення і г.д.

П о л ь ш ч а. Пра поўнамаштабнае навуковае даследаванне тэмы вызвалення Беларусі ў сучаснай польскай гістарыяграфіі мы пакуль не ведаем. Аднак добра вядома праца польскага даследчыка Роберта Урублеўскага «Бабруйскі кацёл 1944 года» [19], якая па сваёй значнасці не саступае нават некаторым афіцыйным выданням у айчыннай гістарыяграфіі, таму што раскрывае асаблівасці баявых падзей на адным з ключавых пунктаў нямецкай абароны, ператворанай у раёне Бабруйска ў сапраўдную непрыступную крэпасць. У склад бабруйскай нямецкай групоўкі ўваходзіла 10 дывізій, у тым

ліку вядомая аўстрыйская 45-я пяхотная дывізія, якая ў 1941 г. штурмавала Брэсцкую крэпасць, а таксама 20-я танкавая дывізія, што разам з іншымі падраздзяленнямі налічвала больш за 250 танкаў, штурмавых гармат і знішчальнікаў танкаў. Бабруйскі ўдар, як паказвае польскі даследчык, стаў адной з ключавых падзей летняй аперацыі «Баграціён» 1944 г. Да таго ж, разгляд баявых дзеянняў абодвух бакоў прыводзіць аўтара да важнай высновы, што без адначасовага абвалу нямецкай абароны ў раёне Бабруйска і Віцебска наступленне на Мінск з акружэннем 4-й нямецкай палявой арміі і агульным крушэннем усяго фронту групы армій "Цэнтр" было б немагчымым [19, с. 5].

У гэтым плане хацелася б агучыць выказванне вядомага расійскага даследчыка, бліскучага знаўцы баявых дзеянняў як Чырвонай арміі, так і Германскага вермахта на ўсходнім фронце, у тым ліку гісторыі Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі 1944 г., А. В. Ісаева. У кароткай прадмове да рускага выдання кнігі Р. Урублеўскага расійскі ваенны даследчык заключае: «Ситуация по изучению войны качественно изменилась сравнительно недавно, в конце 1980-х и начале 1990-х годов. Тем не менее с момента этого качественного перелома прошло уже около четверти века. Поэтому сегодня, когда от событий войны нас отделяет уже более семи десятилетий, писать ее историю по старинке, перефразируя известное высказывание, это даже не ошибка, это преступление. Хорошим тоном и даже строго обязательным для исследователей войны является привлечение документальных данных обеих сторон» [19, с. 9]. І апошняе для ўсіх нас павінна стаць не прапісной гіпотэзай, а практычнай аксіёмай.

Таму з вялікім задавальненнем адзначым, што якраз такім правілам кіруецца польскі даследчык Р. Урублеўскі, які шмат гадоў займаецца вывучэннем баявых дзеянняў на савецка-германскім фронце пераважна на завяршальным этапе вайны. Яго практыка грунтуецца на аналізе дакументаў абодвух бакоў, як нямецкіх, так і савецкіх, на падставе чаго ён праводзіць і сваё новае гістарычнае даследаванне аб баявых дзеяннях вермахта і Чырвонай арміі ў раёне Бабруйска. Як адзначана ў даследаванні, на момант правядзення летняй аперацыі на тэрыторыі Беларусі сам горад Бабруйск быў пераўтвораны ў крэпасць з дасканалай сістэмай абароны – на ўсходнім беразе Бярэзіны былі створаны тры кальцы абароны, а на заходнім – пяць. Абарону на Бабруйскім напрамку займалі два корпусы 9-й арміі, у склад якіх уваходзілі 6-я, 35-я, 36-я, 45-я, 129-я, 134-я, 296-я і 383-я пяхотныя дывізіі, у рэзерве знаходзіліся 707-я пяхотная і 20-я танкавая дывізіі. Непасрэдную падтрымку ажыццяўлялі семдзесят тры штурмавыя гарматы і пяцьдзясят восем знішчальнікаў танкаў. Апроч таго, у рэзерве знаходзіліся дзевяноста тры танкі і дваццаць восем знішчальнікаў танкаў. Аднак па выніку праведзенага аналізу аўтар заключае, што гэтыя сілы былі зусім не гатовыя адбіць удар, нанесены Чырвонай арміяй [19, с. 14, 15].

Заўважым, што ў аснову яго даследавання пакладзены дакументы Ліквідацыйнага штаба вермахта, створанага для збору інфармацыі аб цалкам знішчаных злучэннях, што падлягалі расфарміраванню. Гэтыя архіўныя матэрыя-

лы (баявыя зводкі і рапарты, складзеныя ацалелымі афіцэрамі, а таксама паказанні салдат, якія вырваліся з акружэння пад Бабруйскам) упершыню ўведзены ў навуковы зварот і праліваюць святло на шматлікія дэталі Бабруйскага «катла» і крах групы армій «Цэнтр», што стала страшнай катастрофай Германскага вермахта. Узнікае пытанне, чаму беларуская гістарыяграфія да гэтага часу не надала належнай увагі гэтаму даследаванню, падобнаму ў падыходах да найноўшых прац расійскіх гісторыкаў А. В. Ісаева і М. У. Сініцына.

Г е р м а н і я. Навуковае даследаванне гэтай тэмы нямецкімі гісторыкамі ў апошні час вялося ў рамках завяршэння праекта Ваенна-гістарычнага ўпраўлення па вывучэнні гісторыі Германскага рэйха і Другой сусветнай вайны. У выніку быў падрыхтаваны асобны том, фактычна амаль цалкам прысвечаны гістарычным падзеям на Усходнім фронце ў 1943–1944 гг., у тым ліку баявым дзеянням Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі ў ходзе яе поўнага вызвалення. Заўважым, што на гэты момант нямецкая праца добра вядома шырокаму беларускаму чытачу [20]. У адрозненне ад прадстаўнікоў беларускай і расійскай нацыянальных школ нямецкія даследчыкі шырока выкарыстоўваюць дакументальныя крыніцы з архіваў Расіі для абгрунтаванага вывучэння тых падзей, што мелі месца на беларускай тэрыторыі на завяршальным этапе вайны. На наш погляд, на цяперашні час для нямецкіх гісторыкаў аксіёмай з’яўляецца той тэзіс, што нельга правесці якаснае даследаванне баявых дзеянняў паміж войскамі Чырвонай арміі і Германскага вермахта на савецка-германскім фронце, аб’ектыўна рэканструяваць гісторыю тых падзей без абавязковага ўліку дакументальных крыніц і гістарыяграфічных фактаў супрацьлеглых бакоў.

Так, нямецкі даследчык доктар К.-Г. Фрызер, які працаваў з масівам самых розных дакументаў, у тым ліку з РДзВА і ЦАМА, даволі падрабязна раскрывае характар тых гістарычных падзей у згаданай вышэй працы «Усходні фронт 1943/44» [15]. У дачыненні да баявых дзеянняў летам 1944 г. ён адзначае, што яны ствараюць асобную главу, якая наўрад ці была ў ранейшай ваеннай гісторыі, асабліва з улікам свайго драматызму і маштабных страт. У той жа час нямецкі аўтар лічыць, што для савецкіх гісторыкаў баявыя дзеянні Чырвонай арміі ў 1943 г. даволі доўгі час знаходзіліся пад забаронай, таму набылі характар «забытай вайны» [14, S. 277]. У даследаванні канстатуецца факт таго, што германскія войскі групы армій «Цэнтр» летам 1943 г. былі ўжо не ў стане стрымліваць узрастаючы націск Чырвонай арміі, паколькі на той час кожнай з 4 германскіх армій, якія знаходзілася на беларускай тэрыторыі, супрацьстаяў цэлы фронт ці спецыяльная армейская групоўка. Да таго ж, у тыле германскіх войскаў дзейнічалі больш за 100 тысяч савецкіх партызан. На думку Фрызера, тэарэтычна ў распараджэнні камандавання для абароны амаль 700-кіламетровага рубяжа на ўсходзе знаходзіліся 42 пяхотныя, 4 палявыя, 2 танкавыя грэнадзёрскія і 6 танкавых дывізій. Фактычна на справе неабходна казаць пра значна меншыя сілы [15, S. 302].

Дзённікі баявых дзеянняў розных злучэнняў групы армій «Цэнтр», выкарыстаныя для аналізу тых баявых падзей на паўночным участку Цэнтральнага фронту восенню 1943 г., даюць уяўленне пра сапраўдныя маштабы кровапраліцця, якое адбылося на беларускай тэрыторыі на лініі абароны 3-й германскай танкавай арміі. Паводле загаду Гітлера, гэта армія павінна была трымаць «крэпасць Віцебск», так званыя «вароты да Прыбалтыкі». У ходзе зімніх баёў, якія закончыліся ў сярэдзіне студзеня 1944 г., абодва бакі панеслі значныя страты. Пры гэтым з нямецкага боку яны складалі 19 150 забітых, параненых і прапаўшых без вестак, а з савецкага, паводле афіцыйных звестак, 6 наступаючых савецкіх армій страцілі 135 012 чалавек і больш за 1 200 танкаў [15, S. 317].

Галоўным аб'ектам на цэнтральным участку з'яўлялася шаша Масква – Мінск, уздоўж якой вялі наступленне 7 савецкіх армій. Ім супрацьстаяла толькі адна 4-я германская армія, у складзе якой на 1 лістапада 1943 г. было 193 510 чалавек, пры гэтым ніводнай танкавай дывізіі. За паўгода на гэтым напрамку войскі савецкага Заходняга фронту (дзейнічаў па 24 красавіка 1944 г.) правялі 8 наступальных аперацый: 5 на паўночным флангу паблізу Оршы, 2 – на паўднёвым, і толькі адна вялікая наступальная аперацыя была ажыццёўлена ўздоўж самой шашы. З дакументаў вынікае, што ніводная з 11 наступальных аперацый, праведзеных Чырвонай арміяй супраць германскіх 4-й палявой і часткова 3-й танкавай армій, не была паспяховай. Як паказвае нямецкі гісторык, савецкія войскі страцілі 530 537 чалавек параненымі і забітымі, страты ж нямецкага боку з 12 кастрычніка 1943 г. да канца сакавіка 1944 г. склалі 10 566 забітых і прапаўшых без вестак і 24 490 параненых [15, S. 324].

Кажучы пра крах групы армій «Цэнтр» летам 1944 г., Фрызер аналізуе вынікі баявых падзей у ходзе паспяхова праведзенай наступальнай аперацыі «Баграціён», якая прывяла да катастрофы гэтай групы. Паводле дакументальных крыніц, наступаючым савецкім войскам супрацьстаялі сілы 2-й, 4-й і 9-й палявых і 3-й танкавай армій агульнай колькасцю 486 493 салдаты, а таксама 3 236 гармат, 118 танкаў і 452 САУ, 602 самалёты [15, S. 532]. Тады як у айчыннай літаратуры выкарыстоўваюцца такія звесткі: «В общей сложности на белорусском направлении действовали 63 дивизии. В них насчитывалось 1,2 млн человек, 900 танков и штурмовых орудий, 9 500 полевых орудий и минометов. С воздуха германские войска поддерживала авиация 6 и частично 1 и 4-го воздушных флотов в количестве 1 350 боевых самолетов» [14, с. 55]. Нямецкі гісторык адзначае, што з пачаткам першай фазы аперацыі «Баграціён» савецкі бок пераўзыходзіў праціўніка ў жывой сіле ў 3,7 раза, артылерыі – 9,4, колькасці танкаў – 23, самаходных установак – 3,6 і самалётаў – 10,5 раза. Да таго, групе армій «Цэнтр» давялося весці вайну фактычна на два франты: у якасці «другога фронту» выступалі амаль 150 тысяч партызан, якія дзейнічалі ў тыле нямецкіх армій [15, S. 534].

У дачыненні да канчатковых страт, панесеных з савецкага боку ў ходзе аперацыі «Баграціён», нямецкі ваенны гісторык адзначае, што ў жывой сіле яны складалі 770 888 чалавек (з якіх 180 040 – забітыя і прапаўшыя без вестак, 590 848 – параненыя). Апрача таго, савецкі бок страціў 2 957 танкаў і САУ, 2 447 адзінак артылерыі і 822 самалёты [15, S. 593].

Катастрофу групы армій «Цэнтр» наглядна характарызуюць статыстычныя даныя аб стратах, панесеных з абодвух бакоў падчас правядзення летняй аперацыі ў Беларусі. Паводле нямецкіх звестак, агульныя страты з нямецкага боку склалі 399 102 чалавекі, у тым ліку: 26 397 – забітыя, 262 929 – прапаўшыя без вестак і 109 776 – параненыя. Гэта пераўзыходзіць маштабы нямецкай катастрофы ў бітве пад Вердэнам у 1916 г., калі германскі рэйхсвер страціў 330 тыс. чалавек (разам з параненымі), і значна пераўзыходзіць страты 6-й германскай арміі пад Сталінградам (60 тысяч забітымі і 110 тысяч палоннымі) [15, S. 594]. Фрызер заключае, што аперацыя «Баграціён» застаецца самай бліскучай аперацыяй, праведзенай Чырвонай арміяй на працягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны [15, S. 600].

Такім чынам, нават кароткі аналіз фундаментальных даследаванняў, праведзеных у апошнія гады прадстаўнікамі розных нацыянальных гістарыяграфій – вядучымі гісторыкамі Беларусі, Расіі, Польшчы і Германіі, прыводзіць не толькі да важных высноў, але і ставіць на парадак дня цэлы комплекс даследчыцкіх праблем.

1. Факталагічныя: па-першае, у беларускай гістарыяграфіі на гэты час нам не вядома ні адна работа, якая была праведзена на аснове метаду кампаратыўнага аналізу баявых дзеянняў Чырвонай арміі і Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 г.; па-другое, пакуль што адсутнічаюць даследаванні, якія на базе арыгінальных крыніц савецкага і нямецкага паходжання спрабавалі б рэканструяваць тыя гістарычныя падзеі такімі, якімі яны былі ў сапраўднасці; па-трэцяе, нявырашанасць згаданых праблем звязана з захаваннем устойлівай практыкі выкарыстання айчыннымі гісторыкамі хоць і больш пашыранай базы новых дакументальных крыніц, аднак без абавязковага звароту да звестак з арыгінальных нямецкіх дакументаў і найноўшых замежных даследаванняў;

2. Метадалагічныя: па-першае, патрабуе асобнай увагі праблема навуковых дэфініцый па ваеннай гісторыі. Нам пакуль не вядома праца, якая была б напісана ў рэчышчы найноўшых дасягненняў не толькі айчыннай, але і сусветнай гістарычнай навукі накшталт новага даследавання нямецкага гісторыка К. Герлаха [21]; па-другое, беларускія даследчыкі стаяць перад неабходнасцю пачаць распрацоўку тэорыі і метадалогіі, праблем крыніцазнаўства для вывучэння двухбаковых баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг.; па-трэцяе, адной з умоў далейшай распрацоўкі ваеннай праблематыкі для прафесійных гісторыкаў можа стаць новае прачытанне гісторыі двухбаковых баявых дзеянняў, асновай чаго павінны быць сучасныя метадалагічныя падыходы і новы метадычны інструментарый, сярод якіх адным з правераных шляхоў прырашчэння навуковых ведаў нам бачыцца кампаратыўны падыход.

3. Практычныя: па-першае, непрафесійны чытач ці просты аматар гісторыі без выкарыстання найноўшых падыходаў так і не здолее да канца зразумець сутнасць малавядомых падзей з гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і Германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі ўвосень 1943 – пачатку 1944 г.; па-другое, неабходна публікаваць малавядомыя і новыя дакументы ў суправаджэнні грунтоўных навуковых каментароў, без якіх нельга рухацца наперад ва ўсебаковым вывучэнні малавядомых старонак ваеннай гісторыі; па-трэцяе, неабходна весці адкрытую дыскусію з удзелам прафесійных даследчыкаў, у тым ліку замежных, па важнейшых праблемах ваеннай гісторыі Беларусі на этапе яе канчатковага вызвалення ў 1943–1944 гг.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945 : энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

2. Великая Отечественная война 1941–1945 : энцикл. / гл. ред. М. М. Козлов; редкол.: Ю. Я. Барабаш, П. А. Жилин (зам. глав. ред.), В. И. Канатов (отв. секретарь) [и др.]. – М. : Сов. энцикл., 1985. – 832 с.

3. *Тимохович, И. В.* Битва за Белоруссию: 1941–1944 / И. В. Тимохович. – Минск : Беларусь, 1994. – 254 с.

4. *Лемяшонак, У. І.* Вызваленне без грыфа “сакрэтна” / У. І. Лемяшонак. – Мінск : Полымя, 1996. – 151 с.

5. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авторского коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

6. Освобождение Беларуси 1943–1944 / В. В. Абатуров (рук. авторского коллектива) ; редкол.: И. И. Басик (сопредседатель), А. А. Коваленя (сопредседатель) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2014. – 943 с.

7. Страна в огне : в 3 т. / отв. ред. А. М. Литвин, М. Ю. Мягков; ред. сост. Д. В. Суржик. – М. : ТД «Абрис», 2018. – Т. 3: Освобождение. 1944–1945 : в 2 кн. – Кн. 1: Очерки. – 717 с.

8. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30243 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 12 нояб. 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941–1945. Документы и материалы. – М. : ИЦ «Ретроспектива», 2015. – Т. 8: Освобождение Белоруссии. – С. 57.

9. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30247 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 18 нояб. 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941–1945. Документы и материалы. – М. : ИЦ «Ретроспектива», 2015. – Т. 8: Освобождение Белоруссии. – С. 58.

10. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30268 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 23 дек. 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941–1945. Документы и материалы. – М. : ИЦ «Ретроспектива», 2015. – Т. 8: Освобождение Белоруссии. – С. 58.

11. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 220011 командующим войсками 1-го Прибалтийского и Западного фронтов, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 18 янв. 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941–1945. Документы и материалы. – М. : ИЦ «Ретроспектива», 2015. – Т. 8: Освобождение Белоруссии. – С. 59.

12. Великая Отечественная война. 1941–1945: Военно-исторические очерки : в 4 кн. – М. : Наука, 1999. – Кн. 3: Освобождение. – 510 с.

13. Великая Отечественная война 1941–1945 годов : в 12 т.– М. : Кучково поле, 2012. – Т. 4: Освобождение территории СССР. 1944 год. – 864 с.

14. История Второй мировой войны. 1939–1945 : в 12 т. / гл. редкол.: Д. Ф. Устинов (председатель), П. А. Жилин (зам. председателя) [и др.]. – М. : Воениздат, 1977. – Т. 8: Крушение оборонительной стратегии фашистского блока. – 534 с.

15. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg : In 10 B-de. / Hrsg. von Karl-Heinz Frieser. – München : Deutsche Verlags-Anstalt, 2007. – Bd. 8: Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten. – 1319 S.

16. *Исаев, А. В.* Операция «Багратион». «Сталинский блицкриг» в Белоруссии / А. В. Исаев. – М. : Эксмо, 2014. – 448 с.

17. *Исаев, А. В.* Операция «Багратион». Взлом «белорусского балкона» / А. В. Исаев. – М. : Яуза, 2019. – 448 с.

18. *Синицын, М. В.* Операция «Багратион». «Оба удара главные…». К 75-летию операции / М. В. Синицын. – М. : Агентство Алгоритм, 2019. – 416 с.

19. *Врублевский, Р.* Бобруйский «котел» 1944 года / Р. Врублевский. – М. : Яуза-каталог, 2016. – 320 с.

20. *Новікаў, С. Я.* Савецка-германскі фронт у 1943–1944 гг.: погляд нямецкіх гісторыкаў / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 12. – С. 67–75. – Рэц. на кн.: Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg: In 10 B-de. / Hrsg. von Karl-Heinz Frieser. – München: Deutsche Verlags-Anstalt, 2007. – Bd. 8: Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten – 1319 S.

21. *Gerlach, Ch.* Der Mord an den europäischen Juden. Ursachen, Ereignisse, Dimensionen / Ch. Gerlach. – München : Verlag C.H. Beck, 2017. – 576 S.